УДК 57(075.3=161.3)
ББК 28.0я721
Л63

Пераклад з рускай мовы *М. Л. Страхі*

Рэцэнзенты:
кафедра заалогіі і генетыкі ўстановы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна» (кандыдат педагагічных навук, дацэнт *І. А. Мартысюк*); настаўнік біялогіі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 18 г. Мінска» *Н. І. Гарадовіч*

На першай старонцы вокладкі выкарыстана фота *А. П. Дрыбаса*

**Лісаў, М. Д.**
Л63 Біялогія : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / М. Д. Лісаў. — Мінск : Народная асвета, 2017.— 230 с. : іл.
ISBN 978-985-03-2805-2.

**УДК 57(075.3=161.3)**
**ББК 28.0я721**

**ISBN 978-985-03-2805-2**

© Лісаў М. Д., 2017
© Страха М. Л., пераклад на беларускую мову, 2017
© Афармленне. УП «Народная асвета», 2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# АД АЎТАРА

## Дарагія сямікласнікі!

У гэтым навучальным годзе на ўроках біялогіі вы працягнеце знаёміцца з жывымі арганізмамі. Нагадаем, біялогія (ад грэч. *біяс* — жыццё і *логас* — вучэнне) — гэта навука пра жыццё, пра жывую прыроду.

Вам трэба будзе вывучыць будову і жыццядзейнасць бактэрый, пратыстаў, грыбоў і раслін, асаблівасці іх размнажэння і развіцця, пазнаёміцца з разнастайнасцю відаў жывых арганізмаў, іх значэннем у прыродзе і жыцці чалавека.

Вучэбны дапаможнік уключае дзесяць глаў. Прыступаючы да вывучэння главы, прачытайце ўводны тэкст і інфармацыю аб тым, пра што вы даведаецеся і чаму навучыцеся. Главы складаюцца з параграфаў.

Матэрыял параграфаў падзелены на асноўны і дадатковы. У кожным параграфе ў асноўным тэксце тлустым шрыфтам (або зялёным колерам у рамках) вылучаны тэрміны і паняцці. Дадатковы матэрыял, набраны дробным шрыфтам, прадстаўлены некалькімі рубрыкамі і разлічаны на тых, хто захапляецца біялогіяй. Матэрыял на жоўтым фоне паглыбляе і тлумачыць асноўны тэкст. Матэрыял, прысвечаны некаторым важным навуковым адкрыццям, заключаны ў рамку, а цікавым біялагічным фактам, — размешчаны на зялёным фоне.

У некаторых параграфах змяшчаюцца рэкамендацыі па правядзенні хатніх доследаў — рубрыка «Міні-лаб». Гэтыя доследы выконваюцца па жаданні вучняў пры наяўнасці адпаведных матэрыялаў.

Пасля тэксту кожнага параграфа ідуць вывады, якія адлюстроўваюць самае важнае, што трэба засвоіць. Таксама ў канцы параграфа размешчаны разнастайныя пытанні і заданні, якія дапамогуць вам праверыць засваенне тэмы, паспрабаваць прымяніць атрыманыя на ўроку веды для вырашэння тых ці іншых праблем. Пытанні пазначаны значком , а заданні — значком . У рубрыцы «Рашэнне праблем»  прапануецца на аснове набытых ведаў разабрацца ў сітуацыях, якія блізкія да жыццёвых, і знайсці іх рашэнне.

Жадаю вам поспехаў у вывучэнні біялогіі!